# САЦЫЯЛЬНАЯ ПЕДАГОГІКА І БІБЛІЯТЭРАПІЯ ВА УМОВАХ ПУБЛІЧНАЙ БІБЛІЯТЭКІ

У.А.Акуліч

1. Бібліятэрапія і сацыяльная педагогіка маюць агульную мэту. Яны прызваны дапамагаць людзям, трапіўшым ва ўскладненую жыццевую сітуацыю.

2. Першае ўспамінанне аб бібліятэрапіі адносіцца да 1300г. да н.э. - на кнігасховішчы Рамзеса II у старажытным Егіпце было высечана "Аптэка для душы", а актыўнае выкарыстанне яе пачалі ў сярэдзіне XIX стагоддзя (Э.Руш, В.Гофман, І.Дзядзькоўскі). Аднак, да сучаснага часу не выпрацавана азначэнне бібліятэрапіі і сацыяльнай педагогікі як навукі, не вызначана і кола іх праблем.

3. Як паказала Міжнародная ўстаноўчая канферэнцыя па сацыяльнай педагогіцы, якая адбылася ў Брэсце 7-9 кастрычніка 1992 г. і таксама аналіз літаратуры (Ю.Гапон, А.Пятроўскі, В.Абрамёнкава, А.Шінт, У.Бокарэў, С.Вяршылоўскі, Л.Лесохіна, Т.Шардына і г.д.). Сацыяльная педагогіка таксама яшчэ не вызначылася.

4. Вядучы айчынны спецыяліст па бібліятэрапіі А.М.Міллер вызначыла тры асноўныя напрамкі ў распрацоўцы праблем бібліятэрапіі за мяжой. (Миллер А.М. Некоторые проблемы библиотерапии за рубежом. - 1971. - Вып.36. - С.93-107). Унутры асноўных напрамкаў існуе яшчэ вялікая колькасць больш дробных.

5. Мы прадстаўляем, што сацыяльна-бібліятэчная дзейнасць накіравана на аказанне дапамогі тым групам насельніцтва, якім патрэбна сацыяльная абарона і рэабілітацыя. Ва ўмовах бібліятэкі яна выкарыстоўваецца метадамі масавай работы.

6. Бібліятэрапія, наш погляд, накіравана на аказанне індывідуальный псіхалагічнай рэабілітацыі, шляхам мэтанакіраванага падабранага чытання для вырашэння асабістых праблем.

7. На наш погляд ва ўмовах публічнай бібліятэкі бібліятэрапія павінна вырашыць тры задачы:

1) Аказваць дапамогу чытачам, трапіўшым у складаную жыццевую сітуацыю;

2) Інфармаваць чытачоў па медыцынским ведам і стварэнню доб-

рых эмоцый;

3) Прапагандаваць здаровы вобраз жыцця і, з дапамогай, напраўленага чытання і аутрэнінга, стварыць добрыя умовы для вырашэння праблем здароўя.

Мы лічым, што перад сацыяльнай бібліятэчнай работай стаяць наступныя задачы:

І) Арганізаваць даоуг людзей, якім неабходна сацыяльная абарона;

2) Аб'яднаць іх у згуртаванне, дзе яны змаглі б знайсці свае агульныя інтарэсы і не былі такімі адзінокімі;

3) Адказаць з дапамогай кніг і кансультацый на юрыдычныя пытанні;

4) Выхоўваць і фарміраваць у чытачоў лепшыя чалавечыя каштоўнасці і утрымліваць іх ад дрэнных учынкаў.

8. Наш вопыт выкарыстання бібліятэрапіі быў накоплены сумесна са службай "Даверне" г.Мінска у І984-І985 гг. Два псіхатэрапеўта дзяжурыўшыя там на тэлефоне у тых выпадках, калі бібліятэрапія магла быць карыснай, напраўлялі пацыентаў у бібліятэку, дзе студэнты бібліятэчнага факультэта выконвалі волю бібліятэрапеўтаў.

9. Калі была выкарыстана схема канфліктаў Вельфуоката З.І (Психотерапия в курортологии. - Киев, І986. - С.І4-І5) для падбору літаратуры. Аднак у кожным індывідуальным выпадку мы сумесна з чытачом вырашалі, што чытаць яму далей. Пасля чытання кнігі студэнт-бібліятэрапеўт абавязкова размаўляў з чытачом і абмяркоўваў прачытанае і акцэнтаваў увагу на найбольш важных месцах кнігі.

І0. У аснову падбора былі пакладзены наступныя прынцыпы:

а) даступнасць твора да чытача;

б) сюжэт твора быў блізкі да патрэбнай сітуацыі і герой твора падказваў бы выхад з палажэння;

в) твор абавязкова патрэбен падтрымліваць чытача у складанай сітуацыі;

г) у выпадку дэпрэсіі твор павінен адцягваць ад дзейнасці.

ІІ. Добра зарэкамендавала сябе бібліятэрапія у тых выпадках, калі у чытача з'яўляюцца дэфекты здароўя і ён хоча справіць ці знайсці сябе у жыцці у новай якасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

12. Важнейшым напрамкам у працы публічных бібліятэк з'яўляецца прапаганда здароўя. Мы вывучалі вопыт і працу бібліятэк "здароўя і дабрадзейнасці" ЗША і лічым гэта найболыш перспектыўным напрамкам бібліятэрапіі.

13. На наш погляд, чытач, збіраючыся самастойна ўмацаваць свае здароўе, павінен прачытаць вызначанае кола твораў і зрабіць асабісты індывідуальны план аздараўлення. Затым не меньш 2-3 разоў у нядзелю чытаць літаратуру па гэтай тэме, якая заражала б яго аптымізмам і ведамі. Далей, штодзенна, з дапамогай псіхатрэнінга ен закрапляе ідэі, узятыя з кніг і ўмацоўвае сваю волю, таксама штодзенна вядзе дзеннік самакантролю. Гэта методыка, у вытворчасці, неаднаразова прыносіла поспех.

14. На наш погляд, мае сэнс азнаеміць з асновамі бібліятэрапіі студэнтаў бібліятэчнага факультэта, а таксама медыцынскіх інстытутаў і Акадэміі фізічнай культуры Рэспублікі Беларусь.

## НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ БІБЛІЯТЭЧНАЙ АДУКАЦЫІ ЗША

Т.В.Шабельнік

Інфармацыйная прафесія змяняецца і пашыраецца з надзвычайнай хуткасцю. Каля 60 тысяч новых назваў кніг публікуецца у ЗША кожны год. У Злучаных Штатах за апошнія 40 гадоў колькасць бібліятэк усіх тыпаў і відаў павялічылася у 4 разы. Колькасць публічных бібліятэк налічвае каля 9 тысяч і 65000 філіялаў. Спецыяльных жа бібліятэк увогуле налічваецца каля 114 тысяч.

Больш паловы працоўных рэсурсаў ЗША занята вытворчасцю, апрацоўкай і распаўсюджваннем інфармацыі. Усе больш патрабуецца абучаны персанал з вопытам прадбачання, тэхнічным вопытам і здольнасцямі арганізатара.

На сенняшні дзень у вышэйшай бібліятэчнай адукацыі ЗША вылучаюць 3 ступені: бакалаўра, магістра і доктара. У айчыннай вышэйшай адукацыі гэтыя ступені адпавядаюць чатырохгадоваму навучанню без абароны дыплома пяцігадоваму навучанню з абаронай дыплома і аспірантуры з абаронай кандыдацкай дысертацыі. Вышэйшая бібліятэчная адукацыя складае частку універсітэцкай,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ